**Рэлігійная арганізацыя зарэгістравана**
Дзяржаўным камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей Рэспублікі Беларусь
13 мая 1999 г.,
рэгістрацыйны № 114

**Перарэгістравана**
Камітэтам па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь
2 верасня 2004 г.,
рэгістрацыйны № 090

**Перарэгістравана**
Упаўнаважаным па справах рэлігій і нацыянальнасцей 19 мая 2025 г.
рэгістрацыйны № 048

А.А.Румак

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Арцыбіскуп Мітрапаліт
Мінска-Магілёўскі

_______________ Іосіф Станеўскі

«02» мая 2025 г.

# СТАТУТ

## Рэлігійнай арганізацыі
## “Дабрачынная каталіцкая рэлігійная місія Карытас Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь”

## 1. Агульныя палажэнні

1.1. Рэлігійная арганізацыя "Дабрачынная каталіцкая рэлігійная місія Карытас Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь" з'яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй, якая ажыццяўляе сваю дзейнасць у мэтах распаўсюджвання веры, рэлігійнай асветы, удзелу ў дабрачыннай дзейнасці і справах міласэрнасці.

1.2. Рэлігійная арганізацыя "Дабрачынная каталіцкая рэлігійная місія Карытас Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь" (да змены наймення - Рэлігійная місія "Дабрачынная каталіцкае таварыства Карытас" Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь") дзейнічае з 1999 года, статус юрыдычнай асобы (рэлігійнай організацыі) па заканадаўстве Рэспублікі Беларусь атрымала 13 мая 1999 года.

1.3. Рэлігійная арганізацыя "Дабрачынная каталіцкая рэлігійная місія Карытас Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь" (далей – Місія) утворана Арцыбіскупам Мітрапалітам Мінска-Магілёўскім Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь і уваходзіць у склад Рэлігійнай арганізацыі "Мясцовае рэлігійнае аб'яднанне "Мінска-Магілёўская архідыяцэзія Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь".

1.4. Поўнае найменне Місіі:

на беларускай мове: *Рэлігійная арганізацыя "Дабрачынная каталіцкая рэлігійная місія Карытас Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь"*;

на рускай мове: *Религиозная организация «Благотворительная католическая религиозная миссия Каритас Минско-Могилевской архиепархии Римско-католической Церкви в Республике Беларусь».*

Скарочанае найменне Місіі:

на беларускай мове – РА “ДКРМ Карытас ММА”;

на рускай мове – РО «БКРМ Каритас ММА».

1.5. Тэрыторыя дзейнасці Місіі распаўсюджваецца на тэрыторыю дзейнасці Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь (тэрыторыя горада Мінска, Мінскай і Магілёўскай абласцей).

1.6. Місія ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з гэтым Статутам і нормамі кананічнага права Рымска-каталіцкага Касцёла пры захаванні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, Закона Рэспублікі Беларусь “Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях” і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

1.7. Дзяржава не ўскладае на Місію выкананне якіх-небудзь дзяржаўных функцый, не ўмешваецца ў дзейнасць Місіі, калі яна не супярэчыць заканадаўству. У дзейнасці Місіі не выкарыстоўваецца іншая сімволіка, акрамя рэлігійнай, не праводзяцца сходы, мітынгі, пікетаванне, перадвыбарчая агітацыя і іншыя мерапрыемствы палітычнага характару, прапаганда вайны, сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасці, іншай экстрэмісцкай дзейнасці, а таксама выступленні, заклікі, якія абражаюць прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, службовых асоб і асобных грамадзян, прадстаўнікоў іншых рэлігій і іх паслядоўнікаў.

Місія не ажыццяўляе дзейнасць, накіраваную:

супраць суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, асноўных напрамкаў унутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу і грамадзянскай згоды;

на дыскрэдытацыю Рэспублікі Беларусь, прапаганду вайны, сацыяльнай, нацыянальнай, рэлігійнай, расавай варожасці, іншай экстрэмісцкай дзейнасці, прыніжэнне нацыянальнага гонару і годнасці;

на перашкоды рэалізацыі грамадзянамі іх правоў і свабод і выкананню імі іх дзяржаўных, грамадскіх, сямейных абавязкаў;

на нанясенне шкоды здароўю і маральнасці грамадзян;

на перашкоды атрыманню абавязковай агульнай сярэдняй адукацыі;

на прымус паслядоўнікаў і іншых асоб да адчужэння прыналежнай ім маёмасці на карысць рэлігійных арганізацый.

1.8. Місія з'яўляецца юрыдычнай асобай, мае ва ўласнасці адасобленую маёмасць, мае адасоблены баланс, нясе самастойную адказнасць па сваіх абавязацельствах, можа ад свайго імя набываць і здзяйсняць маёмасныя і асабістыя немаёмасныя правы, выконваць абавязкі, быць істцом і адказчыкам у судзе. Місія мае права адкрываць бягучыя і іншыя рахункі ва ўстановах банкаў як у беларускіх рублях, так і ў замежнай валюце, мець круглую пячаць, штампы, бланкі і іншыя рэквізіты са сваім найменнем і сімволікай.

Сімвалам (эмблемай) Карытас, выява якога змешчана на пячаці Місіі, з'яўляецца *чырвоны роўнабаковы крыж, у вуглах якога размешчаныя тры перарывістыя чырвоныя хвалістыя стужкі. На крыжы па гарызанталі надпіс белымі лацінскімі літарамі "Caritas".*

1.9. Місія падтрымлівае міжнародныя сувязі і кантакты, заключае неабходныя для гэтага пагадненні і дагаворы, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь і яе міжнародным абавязацельствам.

1.10. Справаводства Місіі вядзецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі заканадаўства Рэспублікі Беларусь і кананічным правам Рымска-каталіцкага Касцёла.

1.11. Месца знаходжання Місіі: 223040, Мінскі р-н, Бараўлянскі с/с, в. Лескаўка, вул. Карытас, 1.

## 2. Мэты, задачы і формы дзейнасці

2.1. Асноўнымі мэтамі Місіі з'яўляюцца:

- распаўсюджванне і здзяйсненне праз дабрачынную дзейнасць запаведзяў Езуса Хрыста аб хрысціянскай міласэрнасці;
- выхаванне ў людзях любові і павагі адзін да аднаго на падставе прынцыпаў хрысціянскай маралі.

2.2. Асноўнымі задачамі Місіі з'яўляюцца:

- прыём і размеркаванне ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, ахвяраванняў і іншай (у тым ліку гуманітарнай) дапамогі ад фізічных і юрыдычных асобаў, у тым ліку замежнай бязвыплатнай дапамогі;
- арганізацыя надзвычайных акцый дапамогі ахвярам стыхійных бедстваў, войн, эпідэмій, а таксама падтрымка адпаведных міжнародных праграм;
- здзяйсненне доўгатэрміновых і кароткатэрміновых праектаў па будаўніцтве, рамонце і добраўпарадкаванні дабрачынных установаў сумесна з юрыдычнымі асобамі Рэспублікі Беларусь і іншых краін у парадку, устаноўленым заканадаўствам;
- падтрымка некамерцыйных арганізацый, якія аказваюць сацыяльную дапамогу і (або) сацыяльныя паслугі фізічным асобам, сем'ям, якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі;
- падтрымка зарэгістраваных у Рэспубліцы Беларусь рэлігійных арганізацый.

2.3. Асноўнымі формамі дзейнасці Місіі з'яўляюцца:

- дабрачынная дзейнасць;

- аказанне індывідуальнай і групавой сацыяльнай дапамогі і сацыяльных паслуг дзецям-сіротам, малазабяспечаным, хворым, самотным, састарэлым людзям, інвалідам, мнагадзетным, няпоўным, апякунскім і прыёмным сем'ям, людзям без вызначанага месца жыхарства, а таксама людзям (сем'ям), якія знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі, у тым ліку ў сувязі з вымушанай міграцыяй, іншым асобам у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, а таксама на іншыя мэты, вызначаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;
- атрыманне, акумуляванне, выкарыстанне і размеркаванне бязвыплатнай (спонсарскай) дапамогі на мэты, вызначаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;
- атрыманне, выкарыстанне і размеркаванне ахвяраванняў на мэты, вызначаныя Місіяй у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, статутнымі мэтамі і задачамі Місіі;
- арганізацыя адпачынку і аздараўлення дзяцей на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і за мяжой у парадку, устаноўленым заканадаўствам;
- выраб і распаўсюджванне інфармацыйных матэрыялаў, выкарыстанне сродкаў масавай інфармацыі для прапаганды дзейнасці каталіцкага дабрачыннага руху "Карытас" з мэтаю прыцягнення сродкаў для аказання дабрачыннай дапамогі ў адпаведнасці са статутнымі мэтамі і задачамі;
- правядзенне канферэнцый, выстаў, семінараў, сустрэч, рэлігійных, асветніцкіх і іншых мерапрыемстваў у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;
- стварэнне структурных падраздзяленняў для дасягнення статутных мэтаў і рэалізацыі задач Місіі ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

- аказанне дапамогі парафіяльным структурам каталіцкага дабрачыннага руху Карытас на тэрыторыі Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі ў ажыццяўленні дабрачыннай дзейнасці;
- супрацоўніцтва ў правядзенні дабрачынных мерапрыемстваў з дзяржаўнымі ўстановамі, рэлігійнымі і грамадскімі дабрачыннымі арганізацыямі, а таксама з прыватнымі асобамі.

2.4. Місія можа здзяйсняць і іншую, не забароненую заканадаўствам Рэспублікі Беларусь дзейнасць, якая спрыяе рэалізацыі статутных мэтаў і задач.

2.5. Віды дзейнасці, якія падлягаюць ліцэнзаванню, могуць здзяйсняцца толькі пасля атрымання адпаведных ліцэнзій.

2.6. Місія мае права ажыццяўляць прадпрымальніцкую дзейнасць толькі для дасягнення мэтаў, дзеля якіх яна створана, а таксама адпаведную гэтым мэтам.

2.7. Місія мае права вырабляць, набываць, вывозіць з Рэспублікі Беларусь, увозіць у Рэспубліку Беларусь і распаўсюджваць рэлігійную літаратуру, рэлігійныя аўдыё- і відэаматэрыялы, а таксама іншыя прадметы рэлігійнага прызначэння.

2.8. Місія мае права на добраахвотнай аснове прыцягваць грамадзян, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, і юрыдычных асоб для выканання работ, аказання паслуг, накіраваных на падтрымку і забеспячэнне відаў і формаў дзейнасці Місіі, прадугледжаных гэтым Статутам.

## 3. **Органы кіравання**

3.1. Органамі кіравання Місіі з’яўляюцца Арцыбіскуп Мінска-Магілёўскі як кіраўнік Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь, Дырэктар Місіі, Рада Місіі.

3.2. Арцыбіскуп Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі як кіраўнік Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь і заснавальнік Місіі:

- прымае рашэнне аб стварэнні, рэарганізацыі і ліквідацыі Місіі;
- вызначае асноўныя кірункі дзейнасці Місіі;
- зацвярджае Статут Місіі, змены і дапаўненні ў яго;
- прызначае на пасаду і звальняе Дырэктара Місіі (далей – “Дырэктар”);
- здзяйсняе кантроль за фінансава-гаспадарчай дзейнасцю і дзейнасцю кіраўніцтва Місіі.

3.3. Кіраванне дзейнасцю Місіі здзяйсняе Дырэктар, які прызначаецца дэкрэтам Арцыбіскупа Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага. Паўнамоцтвы дырэктара складаюць 5 гадоў. У далейшым Дырэктар можа быць шматразова пераназначаны на новы тэрмін.

3.4. Дырэктарам можа быць прызначаны толькі грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае ў Рэспубліцы Беларусь. Дырэктарам не можа быць асоба, уключаная ў вызначаныя ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку спісы арганізацый, фарміраванняў, індывідуальных прадпрымальнікаў і грамадзян, якія маюць дачыненне да экстрэмісцкай дзейнасці, спіс арганізацый і фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, якія маюць дачыненне да тэрарыстычнай дзейнасці.

3.5. Дырэктар валодае ўсімі правамі кіраўніка юрыдычнай асобы, у тым ліку:

- кіруе ўсёй дзейнасцю Місіі;
- прадстаўляе Місію і дзейнічае ад яе імя ў дзяржаўных органах і ўстановах, грамадскіх, рэлігійных і іншых арганізацыях як Рэспублікі Беларусь, так і замежных краін;
- прызначае і звальняе супрацоўнікаў Місіі;
- вызначае абавязкі супрацоўнікаў Місіі;

- інфармуе Арцыбіскупа Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага аб дзейнасці Місіі;
- мае права першага подпісу на фінансавых і іншых дакументах;
- прымае рашэнні аб набыцці маёмасці Місіі і распараджаецца гэтай маёмасцю;
- выдае даверанасці і заключае дагаворы;
- прымае рашэнні аб стварэнні структурных падраздзяленняў Місіі і зацвярджае палажэнні аб іх;
- зацвярджае гадавы бюджэт і каштарыс выдаткаў Місіі;
- здзяйсняе іншыя паўнамоцтвы, якія ўскладае на яго Арцыбіскуп Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі.

3.6. Дырэктар на час сваёй адсутнасці можа загадам перадаць поўнасцю ці часткова выкананне сваіх абавязкаў намесніку.

Падчас вакансіі пасады дырэктара намеснік выконвае абавязкі Дырэктара.

3.7. Вырашэнне пытанняў, звязаных з водпускам кіраўніка арганізацыі, адносіцца да кампетэнцыі Дырэктара Місіі.

3.8. Памеры аплаты працы Дырэктара Місіі вызначаюцца пры заключэнні працоўнай дамовы з дырэктарам. Памеры стымулюючых выплат, установленых працоўнай дамовай з дырэктарам, вызначаюцца рашэннямі Дырэктара Місіі у адпаведнасці з заканадаўствам і лакальнымі актамі, якія дзейнічаюць у Місіі.

3.9. Рада Місіі (далей – “Рада”) – гэта дарадчы орган у складзе чатырох асобаў, які ствараецца Дырэктарам. Персанальны склад Рады зацвярджаецца загадам Дырэктара і пераглядаецца па меры неабходнасці па заканчэнні паўнамоцтваў Дырэктара або па рашэнні Дырэктара.

3.10. Пасяджэнні Рады праводзяцца па меры неабходнасці, але не радзей за адзін раз у паўгоддзе.

3.11. Рада:

- распрацоўвае і выносіць на разгляд Арцыбіскупа Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага прапановы аб унясенні зменаў і дапаўненняў у Статут Місіі;
- рэкамендуе Дырэктару кандыдатуру яго намесніка;
- уносіць рэкамендацыі па кадравых пытаннях;
- абмяркоўвае стан фінансавых і маёмасных фондаў, ;
- распрацоўвае гадавыя планы работы Місіі;
- заслухоўвае гадавыя справаздачы аб дзейнасці Місіі, абмяркоўвае праблемы рэалізацыі дабрачынных праектаў і вызначае шляхі і спосабы іх вырашэння;
- вызначае гадавы бюджэт і каштарыс выдаткаў Місіі і прадстаўляе іх на зацвярджэнне Дырэктара;
- выносіць на разгляд Арцыбіскупа Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага, Дырэктара, прапановы па любых пытаннях дзейнасці Місіі.

3.12. Рашэнні Рады прымаюцца адкрытым галасаваннем і афармляюцца пратаколам пасяджэння Рады.

## 4. Сродкі і маёмасць

4.1. Сродкі Місіі фарміруюцца за кошт:

- добраахвотных ахвяраванняў фізічных і юрыдычных асобаў як Рэспублікі Беларусь, так і замежных краін;
- паступленняў у рамках праектнай дзейнасці Місіі, у тым ліку замежнай бязвыплатнай дапамогі;
- датацый Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь;
- паступленняў ад правядзення канферэнцый, выстаў, семінараў, сустрэч, рэлігійных, асветніцкіх, аздараўленчых і іншых мерапрыемстваў;

- маёмасці, якая перададзена ў спадчыну, атрымана ў дар або атрымана іншым спосабам, не забароненым дзеючым заканадаўствам.
- паступленняў ад дзейнасці Місіі з іншых крыніцаў, не забароненых дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

4.2. Місія валодае правам уласнасці на маёмасць, набытую або створаную ёю за кошт уласных сродкаў, ахвяраваную юрыдычнымі або фізічнымі асобамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі, перададзеную Місіі ва ўласнасць дзяржавай або набытую іншым спосабам, які не супярэчыць заканадаўству.

4.3. Маёмасць, якая перадаецца Місіі мясцовым рэлігійным аб'яднаннем "Мінска-Магілёўская архідыяцэзія Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь" для дасягнення статутных мэтаў і задач Місіі, замацоўваецца за Місіяй на праве аператыўнага кіравання. Місія можа перадаваць маёмасць, перададзеную ёй мясцовым рэлігійным аб'яднаннем "Мінска-Магілёўская архідыяцэзія Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь" на праве аператыўнага кіравання, у карыстанне іншым рэлігійным арганізацыям толькі са згоды Арцыбіскупа Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага.

4.4. Ва ўласнасці Місіі могуць знаходзіцца капітальныя будынкі, зямельныя ўчасткі і іншыя аб'екты нерухомасці, абсталяванне і маёмасць вытворчага, сацыяльнага, культурна-асветніцкага, аздараўленчага і іншага прызначэння, грашовыя сродкі, у тым ліку ў замежнай валюце, транспартныя сродкі, прадметы рэлігійнага прызначэння і іншая маёмасць і каштоўнасці, неабходныя для забеспячэння статутнай дзейнасці Місіі.

4.5. Місія можа выкарыстоўваць для сваіх патрэбаў будынкі і маёмасць, якія прадстаўляюцца ёй на дагаворных пачатках дзяржаўнымі, грамадскімі, рэлігійнымі арганізацыямі, іншымі юрыдычнымі

асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі або прыватнымі асобамі.

4.6. Сродкі і маёмасць Місіі выкарыстоўваюцца толькі для дасягнення статутных мэтаў і задач і адпаведна гэтым мэтам.

## 5. Спыненне дзейнасці

5.1. Дзейнасць Місіі можа быць спынена ў парадку, вызначаным заканадаўствам:

- па рашэнні заснавальніка Місіі (Арцыбіскупа Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага);
- па рашэнні суда ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

5.2. У выпадку ліквідацыі Місіі яе маёмасць перададзеная ёй на бязвыплатнай аснове ва ўласнасць (карыстанне) дзяржавай, а таксама перададзеная ёй у карыстанне юрыдычнымі і фізічнымі асобамі, у тым ліку індывідуальнымі прадпрымальнікамі, вяртаецца дзяржаве, асобам, якія перадалі маёмасць.

5.3. Пры ліквідацыі ўласная маёмасць Місіі, якая засталася пасля разлікаў з крэдыторамі, пераходзіць у распараджэнне мясцовага рэлігійнага аб'яднання "Мінска-Магілёўская архідыяцэзія Рымска-каталіцкага Касцёла ў Рэспубліцы Беларусь".

5.4. На маёмасць культавага прызначэння, якая знаходзіцца ва ўласнасці Місіі, не можа быць звернута спагнанне па прэтэнзіях крэдытораў.

## 6. Заключныя палажэнні

6.1. Змены і дапаўненні ў дадзены Статут, зацверджаныя Арцыбіскупам Мітрапалітам Мінска-Магілёўскім, падлягаюць дзяржаўнай

рэгістрацыі ў парадку, вызначаным для рэгістрацыі рэлігійных арганізацый, і ўступаюць у сілу з даты іх дзяржаўнай рэгістрацыі.

6.2. У выпадках, не прадугледжаных дадзеным Статутам, Місія кіруецца нормамі кананічнага права Рымска-каталіцкага Касцёла і патрабаваннямі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

6.3. Дадзены Статут уступае ў сілу з даты яго дзяржаўнай рэгістрацыі.

Прошито и скреплено печатью 13 (тринадцать) листов

Консультант отдела по делам религий
аппарата Уполномоченного по делам
религий и национальностей Е.Д.Чебатарева